**Рэкамендацыі па падрыхтоўцы да ЦЭ і ЦТ па беларускай мове**

На ЦЭ / ЦТ па беларускай мове даецца **120 хвілін** (або 2 гадзіны). У тэсце ўсяго **40 заданняў**: 18 заданняў у частцы А + 22 заданні ў частцы В.

***Агульныя рэкамендацыі:***

1. Уважліва прачытайце інструкцыю па выкананні тэста (гэта інфармацыя перад тэставымі заданнямі).
2. Сачыце за часам!
3. Уважліва чытайце заданне! **Да канца!**
4. Чытайце, не спяшаючыся, **усе** прапанаваныя варыянты адказаў!
5. Калі заданне падаецца цяжкім або незразумелым, прапусціце яго. Але не забудзьцеся да яго вярнуцца!
6. Запісвайце адказы спачатку ў чарнавік.
7. Уважліва пераносьце адказы ў бланк адказаў! Праверце нумар пытання і пастаўце метку ў патрэбную клетку!
8. У частцы А адказы трэба выбраць з прапанаваных.
   **!!!** З пяці прапанаваных адказаў правільнымі могуць быць **два** або **тры!**
9. У частцы В **толькі адзін** правільны адказ, які трэба запісаць словам (напрыклад, ШЧАСЦЕ), лічбай (напрыклад, 3) або спалучэннямі літар і лічбаў (напрыклад, А1Б2В3Г4).
10. **Памятайце!** На кожнае заданне трэба напісаць адказ! Гэта лепш, чым пакінуць пустыя клеткі!

***Рэкамендацыі па выкананні заданняў:***

**ФАНЕТЫКА і АРФАЭПІЯ**. Што трэба памятаць?

- ✓ напісанне і вымаўленне слова можа адрозніваццa
- ✓ ***е, ё, ю, я*** – гэта літары, не гукі! Гэтыя літары могуць абазначаць адзін [*э, о, у, а*] або два гукі [*йэ, йо, йу, йа*]
- ✓ зычныя ў слове могуць аглушацца (*ця**ж**ка*) і азванчацца (*про**сь**ба*)
- ✓ зычныя [***з, с, дз, ц***] змякчаюцца перад мяккімі (***с**ветлы*) (АЛЕ не змякчаюцца перад [***г’, к’, х’***])

**АРФАГРАФІЯ**. Што трэба памятаць?

- ✓ **выключэнні з правіл**
- ✓ ***о*** пішацца толькі пад націскам
- ✓ ***я*** пішацца ў першым складзе перад націскам
- ✓ напісанне зычных правярайце праз падбор праверачнага слова (*пя**с**чаны – пя**с**ок*)
- ✓ ***ь*** пішацца **толькі** пасля літар ***з, с, дз, ц, л, н***
- ✓ ***апостраф*** пішацца перад ***е, ё, ю, я, і***
- ✓ пасля ***ў*** апостраф не пішацца
- ✓ складаныя назоўнікі пішуцца разам або праз злучок
- ✓ складаныя прыметнікі пішуцца разам або праз злучок (**асобна** пішуцца спалучэнні прыслоўе + прыметнік)
- ✓ прыслоўі пішуцца разам або праз злучок (**асобна** пішуцца спалучэнні прыназоўнік + назоўнік)

**МАРФЕМІКА**. Як разабраць слова па саставу?

- ✓ **вызначаем канчатак:** канчаткі ёсць толькі ў слоў, якія могуць змяняцца па склонах, ліках (як назоўнік), родах (як прыметнік), асобах (як дзеяслоў)

- ✓ канчатак можа быць нулявым, г.зн. канчатак не выражаны літарай, але ён з'явіцца, калі змяніць слова (*лес□ – у лесе*)
- ✓ канчатка **няма** ў нязменных словах (гэта нескланяльныя назоўнікі тыпу *метро, авакада* і прыметнікі тыпу *хакі, клёш*, інфінітыў, дзеепрыслоўе, прыслоўе, службовыя часціны мовы – прыназоўнікі, злучнікі, часціцы)
- ✓ **вызначаем корань:** падбіраем аднакаранёвыя словы і вызначаем корань
- ✓ марфема перад коранем – гэта **прыстаўка**
- ✓ **для вызначэння суфікса / суфіксаў** падбіраем аднакаранёвыя словы без суфікса
- ✓ **постфіксы:** *-сьці, -небудзь, -ся (-ца, -цца)*

**СЛОВАЎТВАРЭННЕ**. Што трэба памятаць?

- ✓ падбіраем слова, ад якога ўтварылася дадзенае
- ✓ пры ўтварэнні слова да ўтваральнай асновы можа дабаўляецца **адзін** суфікс (суфіксальны спосаб), **адна** прыстаўка (прыставачны спосаб), **адна** прыстаўка + **адзін** суфікс (прыставачна-суфіксальны спосаб)
- ✓ пры дабаўленні прыстаўкі часціна мовы не мяняецца
- ✓ бяссуфіксным спосабам утвараюцца, напрыклад, назоўнікі ад дзеясловаў (*подпіс ← падпісаць*), парадкавыя лічэбнікі ад колькасных (*пяты ← пяць*)

**МАРФАЛОГІЯ**. Што трэба памятаць?

- ✓ паўтарыце склоны і склонавыя пытанні
- ✓ назоўнікі ў множным ліку, як правіла, маюць канчаткі ***-ы / -і*** (*карані, азёры*)
- ✓ пачатковая форма для назоўнікаў – гэта форма назоўнага склону, адзіночнага ліку; для прыметнікаў – гэта форма назоўнага склону, адзіночнага ліку, мужчынскага роду; для займеннікаў – гэта форма назоўнага склону, адзіночнага ліку (калі магчыма), мужчынскага роду (калі магчыма), для дзеяслова – інфінітыў
- ✓ простая форма *вышэйшай ступені* параўнання прыметніка ўтвараецца так: аснова прыметніка + суфіксы ***эйш / ейш*** (*дужэйшы*); простая форма ***най**вышэйшай ступені* параўнання ўтвараецца так: прыстаўка ***най*** + форма вышэйшай ступені параўнання (***най**дужэйшы*)
- ✓ пры спражэнні дзеясловаў не мяняйце трыванне (*перапісаць – перапішу* ~~*перапісваю*~~)
- ✓ пры ўтварэнні дзеепрыслоўя памятайце пра захаванне трывання дзеяслова: дзеяслоў незакончанага трывання *што рабіць?* → дзеепрыслоўе незакончанага трывання *што робячы? (глядзець – гледзячы);* дзеяслоў законачанага трывання *што зрабіць?* → дзеепрыслоўе законачанага трывання *што зрабіўшы? (паглядзець – паглядзеўшы)*
- ✓ звярніце ўвагу на правапіс лічэбнікаў: *пяцьдзЯсят, шэсцьдзЯсят*, але *семдзЕсят, восемдзЕсят*, а таксама *дзвесце, семсот, восемсот*

**СІНТАКСІС**. Што трэба памятаць?

- ✓ вызначайце граматычную аснову ў сказах (дзейнік і выказнік)
- ✓ для вызначэння сінтаксічнай функцыі слова разбярыце сказ па членах сказа: дзейнік, выказнік, дапаўненне, азначэнне, акалічнасць
- ✓ усе словы ў дзеепрыметнікавым і дзеепрыслоўным зваротах з'яўляюцца адным членам сказа
- ✓ у складаных сказах вызначайце межы граматычных частак і іх колькасць
- ✓ калі ў заданні прыводзіцца схема складанага сказа, уважліва паглядзіце, колькі ў ёй граматычных частак і які знак прыпынку паміж імі стаіць

**ПУНКТУАЦЫЯ**. Што трэба памятаць?

- ✓ чытайце ўважліва заданне, каб правільна вызначыць, дзе **ставіць** або **не ставіць** у простых ці складаных сказах знакі прыпынку (коска, працяжнік, двукроп’е, дужкі)
- ✓ у складаназлучаным сказе паміж граматычнымі часткамі ставіцца коска [ ], *злучнік* [ ], кропка з коскай [ ]; *злучнік* [ ] або працяжнік [ ] – *злучнік* [ ]
- ✓ у складаназалежным сказе паміж часткамі ставіцца коска [ ], (*злучнік / злуч.слова* )
- ✓ у бяззлучнікавым складаным сказе паміж граматычнымі часткамі ставіцца коска [ ], [ ], кропка з коскай [ ]; [ ], працяжнік [ ] – [ ] або двукроп’е [ ]: [ ]
- ✓ памятайце, што ў некаторых выпадках знакі прыпынку ў складаных сказах паміж граматычнымі часткамі могуць не ставіцца
- ✓ у сказах з простай мовай трэба правільна вызначыць словы аўтара і саму простую мову

**СТЫЛІСТЫКА**. Што трэба памятаць?

- ✓ існуе **пяць** стыляў маўлення
- ✓ **навуковы стыль:** паведамляецца пра навуковыя паняцці
- ✓ **публіцыстычны стыль:** паведамляецца пра падзеі ў жыцці грамадства, знакамітыя мясціны, помнікі архітэктуры, вядомых асоб і пад.
- ✓ **мастацкі стыль:** расказваецца пра падзею, выпадак або здарэнне ў жыцці героя
- ✓ **афіцыйны стыль:** тэкст з’яўляецца дакументам (аб’ява, закон, дагавор і пад.)
- ✓ **гутарковы стыль:** тэкст з’яўляецца размовай блізкіх людзей у неафіцыйных абставінах
- ✓ **у ЦЭ і ЦТ даюцца** тэксты публіцыстычнага, мастацкага або навуковага стыляў**!**

**Поспехаў! ☺**

100 БАЛЛОВ
РЕПЕТИТОРСКИЙ ЦЕНТР